ПАСТАНОВА МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
20 красавіка 2021 г. № 71

# Аб змяненні пастановы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 6 мая 2020 г. № 83

На падставе часткі трэцяй пункта 3 артыкула 167 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Унесці ў пастанову Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 6 мая 2020 г. № 83 «Аб тыпавых вучэбных планах агульнай сярэдняй адукацыі» наступныя змяненні:

1.1. у тыпавым вучэбным плане базавай школы, яслей-сада – базавай школы, дзіцячага сада – базавай школы, зацверджаным гэтай пастановай:

пазіцыю

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| «II. Факультатыўныя, стымулюючыя, падтрымліваючыя заняткі | 6<br>$8^3$ | 6<br>$8^3$ | 6<br>$8^3$ | 6<br>$8^3$ | $6–4^6$ | $6–4^6$ | $6–4^6$ | $6–4^6$ | $8–6^6$» |

замяніць пазіцыяй

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| «II. Факультатыўныя, стымулюючыя, падтрымліваючыя заняткі | 6<br>$8^3$ | 6<br>$8^3$ | 4<br>$6^3$ | 4<br>$6^3$ | $6–4^6$ | $6–4^6$ | $6–4^6$ | $6–4^6$ | $8–6^6$»; |

пункт 4 падпарадковай заўвагі выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«4. Вывучэнне вучэбных прадметаў «Асновы бяспекі жыццядзейнасці», «Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)» здзяйсняецца без выстаўлення адзнак і па дадзеных вучэбных прадметах для вучняў не прадугледжваецца дамашняе заданне.»;

1.2. у тыпавым вучэбным плане сярэдняй школы, школы-інтэрната для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, яслей-сада – сярэдняй школы, дзіцячага сада – сярэдняй школы, зацверджаным гэтай пастановай:

пазіцыю

| | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| «26. Чарчэнне | – | – | – | – | – | – | – | – | – | 1 | –» |

замяніць пазіцыяй

| | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| «26. Чарчэнне | – | – | – | – | – | – | – | – | – | $1–2^{10}$ | –»; |

пункт 5 падпарадковай заўвагі выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«5. Вывучэнне вучэбных прадметаў «Асновы бяспекі жыццядзейнасці», «Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)» здзяйсняецца без выстаўлення адзнак і па дадзеных вучэбных прадметах для вучняў не прадугледжваецца дамашняе заданне.»;

1.3. у тыпавым вучэбным плане гімназіі, зацверджаным гэтай пастановай:

пазіцыю

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| «22. Чарчэнне | – | – | – | – | – | 1 | –» |

замяніць пазіцыяй

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| «22. Чарчэнне | – | – | – | – | – | $1–2^2$ | –»; |

у падпарадковай заўвазе:

пункт 5 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«5. Вывучэнне вучэбных прадметаў «Асновы бяспекі жыццядзейнасці», «Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)» здзяйсняецца без выстаўлення адзнак і па дадзеных вучэбных прадметах для вучняў не прадугледжваецца дамашняе заданне.»;

дапоўніць падпарадковую заўвагу пунктам 6 наступнага зместу:

«6. Вывучэнне вучэбнага прадмета «Замежная мова» ў V–VII класах ажыцяўляецца на павышаным узроўні.»;

1.4. у тыпавым вучэбным плане гімназіі-інтэрната, зацверджаным гэтай пастановай:

пазіцыю

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| «22. Чарчэнне | – | – | – | – | – | 1 | –» |

замяніць пазіцыяй

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| «22. Чарчэнне | – | – | – | – | – | 1–2[2] | –»; |

у падпарадковай заўвазе:

пункт 5 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«5. Вывучэнне вучэбных прадметаў «Асновы бяспекі жыццядзейнасці», «Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)» здзяйсняецца без выстаўлення адзнак і па дадзеных вучэбных прадметах для вучняў не прадугледжваецца дамашняе заданне.»;

дапоўніць падпарадковую заўвагу пунктам 6 наступнага зместу:

«6. Вывучэнне вучэбнага прадмета «Замежная мова» ў V–VII класах ажыцяўляецца на павышаным узроўні.»;

1.5. тыпавы вучэбны план ліцэя, зацверджаны гэтай пастановай, выкласці ў новай рэдакцыі (дадаецца);

1.6. тыпавы вучэбны план кадэцкага вучылішча, зацверджаны гэтай пастановай, выкласці ў новай рэдакцыі (дадаецца);

1.7. падпарадковую заўвагу тыпавога вучэбнага плана санаторнай школы-інтэрната, зацверджанага гэтай пастановай, выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Заўвага. Вывучэнне вучэбных прадметаў «Асновы бяспекі жыццядзейнасці», «Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)» здзяйсняецца без выстаўлення адзнак і па дадзеных вучэбных прадметах для вучняў не прадугледжваецца дамашняе заданне.»;

1.8. падпарадковую заўвагу тыпавога вучэбнага плана сярэдняй школы – вучылішча алімпійскага рэзерву, зацверджанага гэтай пастановай, выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Заўвага. Вывучэнне вучэбных прадметаў «Асновы бяспекі жыццядзейнасці», «Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)» здзяйсняюцца без выстаўлення адзнак і па дадзеных вучэбных прадметах для вучняў не прадугледжваецца дамашняе заданне.».

2. Дадзеная пастанова ўступае ў сілу з 1 верасня 2021 г.

**Міністр** **І.В.Карпенка**

УЗГОДНЕНА
Міністэрства фінансаў
Рэспублікі Беларусь

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
06.05.2020 № 83
(у рэдакцыі пастановы
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
20.04.2021 № 71)

**ТЫПАВЫ ВУЧЭБНЫ ПЛАН**
**ліцэя**

| I. Вучэбныя прадметы | Колькасць вучэбных гадзін на тыдзень па класах | |
|---|---|---|
| | X | XI |
| 1. Беларуская мова | 1–3[1] | 1–3[1] |
| 2. Беларуская літаратура | 2/1–3[1] | 1/2–3[1] |
| 3. Руская мова | 1–3[1] | 1–3[1] |
| 4. Руская літаратура | 1/2–3[1] | 2/1–3[1] |
| 5. Замежная мова | 3–5[1] | 3–5[1] |
| 6. Матэматыка | 4–6[1] | 4–6[1] |
| 7. Інфарматыка | 1–3[1] | 1–3[1] |
| 8. Сусветная гісторыя | 1–2/3[1] | 1–3/2[1] |
| 9. Гісторыя Беларусі | 1–3/2[1] | 1–2/3[1] |
| 10. Грамадазнаўства | 1–2[1] | 1–2[1] |
| 11. Геаграфія | 1–3[1] | 1–3[1] |
| 12. Біялогія | 2–4[1] | 2–4[1] |
| 13. Фізіка | 2–4[1] | 2–4[1] |
| 14. Астраномія | – | 1–2[1] |
| 15. Хімія | 2–4[1] | 2–4 |
| 16. Фізічная культура і здароўе | 2 (0)[2] | 2 (0)[2] |
| 17. Дапрызыўная і медыцынская падрыхтоўка | 1 (0)[2] | 1 (0)[2] |
| 18. Чарчэнне | 1–2[1] | – |
| Абавязковая вучэбная нагрузка ў тыдзень на аднаго вучня | 31 (28)[2] | 31 (28)[2] |
| II. Факультатыўныя, стымулюючыя, падтрымліваючыя заняткі | 9 (12)[2] | 9 (12)[2] |
| Максімальная дапушчальная нагрузка ў тыдзень на аднаго вучня | 34 | 34 |
| Агульная колькасць вучэбных гадзін, якая фінансуецца з бюджэту | 40 | 40 |
| Вучэбна-палявыя зборы (медыцынская практыка):<br>у днях<br>у гадзінах | <br>5 (0)[2]<br>30 (0)[2] | – |

[1] Першая лічба ў ланцужку вызначае колькасць гадзін на вывучэнне вучэбнага прадмета на базавым узроўні, другая – пры вывучэнні вучэбнага прадмета на павышаным узроўні.

[2] У спецыялізаваных па спорце класах: колькасць вучэбных гадзін на вывучэнне вучэбнага прадмета «Фізічная культура і здароўе»; абавязковая вучэбная нагрузка ў тыдзень на аднаго вучня; колькасць факультатыўных, стымулюючых, падтрымліваючых заняткаў.

Заўвагі:

1. Колькасць вучэбных гадзін на вывучэнне вучэбнага прадмета пры арганізацыі адукацыйнага працэсу дома, у арганізацыях аховы здароўя, у санаторна-курортных ці аздараўленчых арганізацыях вызначана тыпавым вучэбным планам сярэдняй школы, школы-інтэрната для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, яслей-сада – сярэдняй школы, дзіцячага сада – сярэдняй школы.

2. Колькасць вучэбных гадзін на вывучэнне вучэбнага прадмета ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі, у якіх навучанне і выхаванне ажыццяўляецца на мове нацыянальнай меншасці ці вывучаецца мова нацыянальнай меншасці, вызначана тыпавым вучэбным планам сярэдняй школы, школы-інтэрната для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, яслей-сада – сярэдняй школы, дзіцячага сада – сярэдняй школы.

3. Вывучэнне вучэбных прадметаў на павышаным узроўні ажыццяўляецца ў розных спалучэннях, напрыклад: матэматыка і фізіка, матэматыка і замежная мова, матэматыка і хімія, хімія і біялогія, беларуская (руская) і замежная мова, замежная мова і грамадазнаўства, біялогія і геаграфія, руская (беларуская) мова і руская (беларуская) літаратура, грамадазнаўства і гісторыя Беларусі, гісторыя Беларусі і сусветная гісторыя.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
06.05.2020 № 83
(у рэдакцыі пастановы
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
20.04.2021 № 71)

**ТЫПАВЫ ВУЧЭБНЫ ПЛАН**
**кадэцкага вучылішча**

| I. Вучэбныя прадметы | Колькасць вучэбных гадзін на тыдзень па класах | | | |
|---|---|---|---|---|
| | VIII | IX | X | XI |
| 1. Беларуская мова | 2 | 2 | 1–3[1] | 1–3[1] |
| 2. Беларуская літаратура | 2/1[2] | 1/2 | 2/1–3[1] | 1/2–3[1] |
| 3. Руская мова | 2 | 2 | 1–3[1] | 1–3[1] |
| 4. Руская літаратура | 1/2 | 2/1 | 1/2–3[1] | 2/1–3[1] |
| 5. Замежная мова | 3 | 3 | 3–5[1] | 3–5[1] |
| 6. Матэматыка | 5 | 4/5 | 4–6[1] | 4–6[1] |
| 7. Інфарматыка | 1 | 1 | 1–3[1] | 1–3[1] |
| 8. Сусветная гісторыя | 1 | 1/2 | 1–2/3[1] | 1–3/2[1] |
| 9. Гісторыя Беларусі | 1 | 1 | 1–3/2[1] | 1–2/3[1] |
| 10. Грамадазнаўства | – | 1 | 1–2[1] | 1–2[1] |
| 11. Геаграфія | 2 | 2/1 | 1–3[1] | 1–3[1] |
| 12. Біялогія | 2 | 1/2 | 2–4[1] | 2–4[1] |
| 13. Фізіка | 2 | 3/2 | 2–4[1] | 2–4[1] |
| 14. Астраномія | – | – | – | 1 |
| 15. Хімія | 2 | 2 | 2–4[1] | 2–4[1] |
| 16. Працоўнае навучанне | – | – | – | – |
| 17. Фізічная культура і здароўе | 2<br>0[3] | 2<br>0[3] | 2<br>0[3] | 2<br>0[3] |
| 18. Дапрызыўная і медыцынская падрыхтоўка | 1 | 1 | 1 | 1 |
| 19. Чарчэнне | – | – | 1–2[1] | – |
| Абавязковая вучэбная нагрузка ў тыдзень на аднаго вучня | 29<br>27[3] | 29/30<br>27/28[3] | 27–31[1]<br>25[3] | 27–31[1]<br>25[3] |
| II. Факультатыўныя, стымулюючыя, падтрымліваючыя заняткі | 7<br>9[3] | 9/8<br>11/10[3] | 12–8[1]<br>14[3] | 12–8[1]<br>14[3] |
| Максімальная дапушчальная нагрузка ў тыдзень на аднаго вучня | 31 | 33 | 34 | 34 |
| Агульная колькасць вучэбных гадзін, якая фінансуецца з бюджэту | 36 | 38 | 39 | 39 |
| Вучэбна-палявыя зборы (медыцынская практыка):<br>у днях<br>у гадзінах | <br>5<br>30 | | <br>5<br>30 | |

[1] Першая лічба ў ланцужку вызначае колькасць вучэбных гадзін на вывучэнне вучэбнага прадмета на базавым узроўні, а таксама абавязковую вучэбную нагрузку ў тыдзень на аднаго вучня, колькасць вучэбных гадзін на правядзенне факультатыўных, стымулюючых і падтрымліваючых заняткаў, максімальную дапушчальную нагрузку ў тыдзень на аднаго вучня пры вывучэнні ўсіх вучэбных прадметаў на базавым узроўні, другая – пры вывучэнні асобных вучэбных прадметаў на павышаным узроўні.

[2] Першая лічба вызначае колькасць вучэбных гадзін на вывучэнне вучэбнага прадмета ў першым паўгоддзі, другая – у другім паўгоддзі.

[3] У спецыялізаваных па спорце класах: колькасць вучэбных гадзін на вывучэнне вучэбнага прадмета «Фізічная культура і здароўе»; абавязковая вучэбная нагрузка ў тыдзень на аднаго вучня; колькасць факультатыўных, стымулюючых, падтрымліваючых заняткаў.